АЛЕГ СТАРЫНЧЫК

КАЗАЧКІ, БАЕЧКІ, ВЕРШЫКІ

ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ І ДАРОСЛЫХ

МІНСК
ТАА "МЭДЖЫК"
2011

УДК 891.161.3-1
ББК 84(Беи)-5
С 77

Старынчык, А. А.

С 77 Казачкі, баечкі, вершыкі для маленькіх і дарослых : вершы / Алег Старынчык. – Мінск : ТАА "Мэджык", 2011. – 152 с., іл.

ISBN 978-985-6473-38-1

Вершы, казкі і байкі Алега Старынчыка адрасаваны дзецям і дарослым. Яны поўныя гумару, радасці і пяшчоты, любові да роднай зямлі, навакольнага света. Гэта байкі пра нас саміх. Сатыра ў вершах аўтара не крыўдзіць, бо створаны яны з вялікай павагай і дабрынёй.

УДК 891.161.3-1
ББК 84(Беи)-5

ISBN 978-985-6473-38-1

© Старынчык, А. А., 2011
© Ілюстрацыі. Жыткевіч, А. В., 2011

ВЕРШЫКІ



Бегемоцік



«Бегемоцік, Бегемоцік!
Ты чаму разявіў роцік?
Ці сабраўся песню пець?
Можа муха заляцець».

І гаворыць Бегемоцік:
«Я таму разявіў роцік,
Бо сказаць усім хачу,
Што я зараз палячу».

«Бегемоцік, Бегемоцік!
У цябе ж такі жывоцік!
Як ты будзеш з ім лятаць?
Можа, лепш на лыжы ўстаць?»

«Я надзьмуюся, як шарык,
Стану лёгкі, як камарык,
Буду лётаць, быццам хмарка,
Па-над нашым заапаркам!»

Бычок і козачка



Козачка пасецца на лужку,
Яна так падабаецца бычку!
Цэлы дзень ён на яе глядзіць,
Тупае, хвалюецца, мычыць:

«Козачка-каханачка, му-му!
Дазволь цябе ласкава абдыму».
Козачка капытцамі ўзбрыкне:
«Не чапаў бы ты, бычок, мя-не!»

Бычок: *«Самы лепшы я сярод бычкоў.*
Усё аддам я за тваю любоў».
Траўку толькі козачка жуе
І ў адказ яму гаворыць: «Не!»

І не ведае бычок, як быць:
«Вось даў Бог казу мне палюбіць!
Козачка-каханачка, ме-ме,
Паглядзі хоць трохі на мяне!»

Козачка: *«Радасці! Не бачыла быка!*
Не трэба мне такога сябрука.
На мяне каб болей не глядзеў,
Траўку б лепей смачненькую еў».

Цялушачка выходзіць на лужок,
Ёй так падабаецца бычок!
Цялушачка: *«Я ляжала на траве ўвесь дзень,*
І пракусіў бачок мне авадзень.

Му-му-му, мой міленькі бычок,
Падыдзі, пачухай мне бачок!»
Як пачула гэта ўсё каза,
Пакацілася з вачэй сляза:

«Я табе пачухаю бачок!!!
Ты не ведаеш, што гэта мой бычок?»
І гаворыць козачка бычку:
«Каханы, пайшлі разам на раку,

Будзем кветачкі духмяныя збіраць,
Купальскія вяночкі надзяваць!»

Бабёр

Увесь час грызе бабёр,
Перагрыз сасновы бор.
І чаго ты скаліш зубы?
Хочаш нам пагрызці трубы?

Коњ сябрује са слоном



Конь сябруе са сланом:
Конь іржэ – смяецца слон.
Застучыць конь капытамі –
Слонік хлопае вушамі.

Заіграе слон трубою –
Конь ківае галавою.
Конік весела гарцуе,
А чагосьці слон сумуе.

Конь устане на дыбкі:
«Ну, давай, як я зрабі!»
Конік радасна ўзбрыкне,
Слонік коніка міне.

Конь: *«Ты чаго такі надзьмуты,*
Вушы – быццам парашуты?
Хобат некуды схаваў,
На мяне ты зазлаваў?»

Слон: *«Я зрабіць так не змагу,*
Бо я не ўзніму нагу!»
Конь: *«Дык цябе я навучу!»*
Кажа слон: «Я не хачу».

Конь: *«Разам ногі ўзнімай,*
Раўнавагу сам трымай».
І адразу слонік устаў,
На трубе зноў заіграў.

«Мой найлепшы сябар конік!» –
На ўвесь свет спявае слонік.

Разышоўся хлопчык Федзя

Разышоўся хлопчык Федзя:
Малпу ўхапіў за нос,
Як убачыць, б'е мядзведзя,
Наступіў кату на хвост.

Маці кажа: «Федзя, Федзя,
Ну ці можна так рабіць?»
Паглядзеў ён на мядзведзя
І гаворыць: «Буду біць!»

Сабраліся цацкі-лялькі,
Падаліся да Наталькі.
Іх Наталька ўсіх шкадуе,
Падкідае і цалуе.

І пытае Федзя маці:
«Дзе падзеліся сябры?
Іх няма нідзе ў хаце,
Ці катаюцца з гары?»

«Усе твае ўжо цацкі-лялькі
Прыжыліся ў Наталькі,
І не хочуць больш да Федзі, –
Кажуць усе яму суседзі, –

Так вось можна неўзабаве
Пагубіць усіх сяброў.
І нічога не паправіш,
Не вярнуцца яны зноў».

Ён абуў свае сандалі
І падаўся да Наталлі.
Кажа дзеўчыне знарок:
«Ад цябе ўцёк бычок.
Ен стаіць, гаворыць «му!»
Я не ведаю, чаму».

Пакуль бегала Наталька,
Ён забраў усе цацкі-лялькі.
Стаў іх гушкаць, цалаваць:
«Буду сам вас шкадаваць!»

Дзед Мароз

Дзе ты ходзіш, Дзед Мароз,
Дзе марозіш ты свой нос?
Я стаю тут самы першы,
Пра цябе чытаю вершы,
Не падглядваю ў паперку.
Мне хутчэй нясі цукерку!
Маша, Віця і Аксана
Ля мяне стаяць таксама.
Усе апрануты прыгожа,
Нават Грыша і Сярожа.
Пра цябе ў нас малюнкі.
Дзе ўсе нашы падарункі?

Цяльпук

Мішка, Міхасёк, Мішук,
Кажуць на яго: «Цялпук».
Ці гавораць: «Міхасёк,
Мешкаваты ты, мяшок».

Усё не добра цялпуку.
Хлопцы пойдуць на раку,
А ён з імі не ідзе –
Цяжка плаваць у вадзе.

Ідуць хлопцы у садок –
Сядзіць ў хаце цялпучок.
Сарваць яблык на галіне –
Рук цялпук ніяк не ўздыме.

Бабуля кажа: «Мой ўнучок,
З'еў бы смачны піражок.
Еш, міленькае дзіцятка,
Будзеш дужы, як цялятка!»

І ўзяў ён піражок,
І цалуе ў бачок.
Есць пірог ужо дваццаты,
Піражкам ён вельмі рады.

«Ніякі я не цялпучок,
Ем я жвава піражок!»

Камарык



Пытаў камарык у карасіка:
«Скажы, карасік , колькі часіку?»
Карасік той плыве пад мосцікам,
Маўчыць і толькі круціць хвосцікам.

А жаба квакае і квакае.
Пытаў камар яе па-ўсякаму.
А жаба: «Я пра час не ведаю,
Табою я, камар, паснедаю».

Камарык гэты быў матросікам,
Укусіў ён жабу носікам.
А жаба надзьмулася шарыкам
І скача, скача за камарыкам.

Сонейка



Сонца-сонейка свеціць ласкавае.
Пакажы ўсё на свеце цікавае!
Горы, рэкі, азёры, палетачкі –
Яны ўсе твае родныя дзетачкі.

Мы чакаем цябе з кожнай раніцай,
Без цябе не пяецца, не марыцца.
Выстаўляем жывоцікі, носікі
Пад твае залатыя валосікі.

Хмарка хоча закрыць цябе, хмурыцца,
І становіцца цёмнаю вуліца.
Гэтак сонейка з намі вітаецца,
Падміргне – і за хмарку схаваецца.

Сонца-сонейка! Свецяць праменьчыкі,
Як патрэбны твае нам струменьчыкі!

Салавейка



Як у нашым у садочку
Салавей спявае ноччу.
Мой міленькі Салавейка,
Не шумі, бо спіць Андрэйка.

І гаворыць Салавейка:
«Пайшла замуж мая дзеўка.
І таму мне ноч не спіцца,
Не магу нагаманіцца».

І за што такое ліха
Нам зрабіла Салаўіха?
Плача ўсю ноч салоўка,
А ў нас баліць галоўка.

Пашкадуй ты нашы вушы
І маленькага Андрушы!
Каб мы ноч цябе не чулі,
Ты б хутчэй ляцеў на гулі.

Прылятай да нас раненька,
Як прачнецца наш Андрэйка.
На світанку, раніцою,
Заспяваем мы з табою.

Салавейка: *«Буду ноччу сустракацца,*
З новай дзеўкай мілавацца.
Буду спаць цяпер я зранку –
Ноччу зноў мне на гулянку.

Няхай гуляецца ціхенька,
Каб не будзіў мяне Андрэйка».
Мой міленечкі Салоўка,
Што ты зранку спіш салодка?

Пройдзе лецейка-ляцейка,
А цябе не чуў Андрэйка.
Каб мы зноў цябе пачулі,
Пакідаў бы тыя гулі.

Наша курка

Наша курка моцна квохча,
Знесці нам яечка хоча.
Маці напячэ блінцоў
Для маленькіх малайцоў.



Грыбочкі

«Растуць грыбкі ў нашым лесе,
Пойдзем мы па іх з Алесяй, –
Кажа яе брат Мікіта, –
Браць не будзем ядавітых».

Зайшлі толькі дзеці ў бор,
Падміргнуў ім мухамор.
Кажа белая паганка:
«З мяне зробіце мачанку!!!»

Фыркае сярдзіта вожык:
«Не бярыце іх у кошык,
Пакажу грыбоў ядомых,
Панясеце іх дадому».

Кожны ведае грыбнік:
Самы лепшы – баравік!
Падбярозавік, апенькі,
Падасінавік маленькі

І вялікі ёсць таксама».
Алеся: *«Гэты грыб так любіць мама!»*
Вожык: *«Вось цікавыя грыбкі –*
Яны завуцца маслякі.

Смачненькія шампіньёны –
Паклявалі іх вароны».

Мікіта: *«Вось, глядзіце – сыраежка –*
Любіць сябар мой Алежка».

Алеся: *«А лісічкі, а лісічкі*
Сядзяць разам, як сястрычкі».

Вожык: *«Толькі ведайце, грыбок*
Вельмі любіць чарвячок.

Зробім на грыбку надрэз,
Паглядзім – чарвяк залез?
Калі няма, ці ён уцёк,
То бяром з сабой грыбок».

Мікіта: *«Вялікі табе дзякуй, вожык!*
Мы грыбоў набралі кошык.
Зробім смачненькіх катлет,
Да нас прыходзь ты на абед!»

Толік і памідорык

Любіць Толік памідорык,
Без яго не выйдзе ў дворык.
І складае каламбуры
Ён пра памідорык буры.

Чырвоную накінуў коўдру,
Каб быць падобным памідору.
Памідорык зацвіце –
Ён шчаслівы ўжо ідзе.

Толік: *«Няма жаху, няма гора,*
Калі столькі памідораў!»
Кіне солі ў кішэнь,
Памідоркі есць увесь дзень.

А яму гаворыць Юля:
«Усяго смачней мая цыбуля!»
Толік: *«Смак у цыбулькі нейкі горкі,*
А ў памідорчыкаў салодкі!»

У яго адна гамонка:
«Памідор ды памідорка».
Глядзіць – на небе зззяюць зоры.
Толік кажа: «Памідоры».

Ідзе дзядзечка Рыгор –
«Таўсматы вы, як памідор!»
У парасяці хвост-вяроўка,
А пятачок – як памідорка.

Расце ў лесе мухамор.
«Вось цікавы памідор!»
На дрэва з дрэва – скок вавёрка.
«Пастой, куды ты, памідорка?

Не баюся нават бойкі,
Мае гранаты – памідоркі!
Па калена мне і мора,
Карабель мой – памідора».

Стаў збірацца ён у горы.
«Ці растуць там памідоры?»
Сустрэўся Толіку грузін:
«Ты на свеце не адзін.

Зваць мяне Георгій, Жора –
Памідоравы абжора.
Пачастуйся – пад язык
З памідоркаю шашлык».

Кажа Толік: «Сапраўды!
Няма лепшай смакаты!!!»
Заспявалі Толік з Жорам:
«Генацвале памідоры!»

Хлусы

Надзеўшы з раніцы трусы,
Хлусяць у двары хлусы.

Марыйка кажа: «У мяне
Ёсць прапелер на спіне.
Зараз я яго ўключу
І над вамі палячу».

«Я – вядомы Чарадзей, –
Кажа дзетачкам Андрэй, –
Чары-бары-чарару!
Вас у ягнят пераўтвару.
Бегаць будзеце ў траве
І крычаць: бе-бе-бе-бе!».

«У мяне чароўны гузік, –
Кажа Пеця-карапузік, –
Я на гузік націскаю,
Ем усё, што загадаю».

Кажа Кастусёк кірпаты:
«Мая дзіўная лапата –
Лапатка гэтая з лапат,
Зараз адшукае клад».

«У мяне ёсць конік Кося, –
Кажа ў панчохах Зося, –
Кось-кось-кось, мой мілы Кося,
Сам сабе ён траўку косіць».
Кастусёк: *«Такія ў цябе панчохі,*
Дапамагла б каню хоць трохі!»

Нахлусяцца за дзень хлусы,
Нават мокрыя трусы.
Нагамоняцца,сядзяць,
Языкі ўжо баляць.
Хлусіць болей неахвота
І дадому йсці ляната.

Юля і варона

Юля, Юлія, Юльяна,
Называюць яе панна.
Павольнаю ідзе хадою.
За ёй – хлопцы чарадою.

Пытае Янка: «Вы, напэўна,
Усяго свету каралеўна
Ці заморская прынцэса,
Што тут робіце ля лесу?»

Юля: *«Што раблю тут менавіта?*
Сёння рана йшла са світай,
Убачыла я кракадзіла,
Карону недзе тут згубіла».

«Карр-алева, карр-карр-она, –
Ад смеху душыцца варона, –
Карр-кадзілы, карр-алі
Ніколі ў лесе не жылі!»

«Ты чаго раскрыла рот? –
Варону запытаў Фядот. –
Яна наша Карралева!
Ты б не каркала, лепш спела».

Варона на дубку дзівіцца:
«Вось як, яна – імператрыца,
Такая ж і з мяне спявачка,
Але пяю я лепш, чым качка.

Карр-карр-алева ў лес хадзіла,
Спужалася там карр-кадзіла.
Згубілася яе карр-она,
Таму за-карр-кала варона».

Слон і парасон

Купіў слонік парасонік,
Скача з ім, нібыта конік.
Слану не трэба капюшон –
Не схавае вушы ён.

Слонік вушкамі махае,
З парасонам падлятае,
Круціць хобат ён – свой носік
І ляціць, як верталёцік.

Вось такі цікавы слон,
У яго ёсць парасон.

Наша дзеўчына Паліна

Наша дзеўчына Паліна –
«Працавітая» дзяўчына.
Узяла з раніцы расчоску,
Круціць гарную прычоску.

Зрабіла модненькі начос,
Ходзіць з ім, задраўшы нос.
Маці кажа на Палінку:
«Падлогу падмяці, дзяўчынка!»

Палінка за жывот бярэцца:
«Захварэла я, здаецца».
Маці: *«Зараз дам табе таблетку!»*
Паліна: *«Лепш дай, мамачка, цукерку.*

Мінулы раз, як я хварэла,
Цукерак, можа, сорак з'ела,
Пакуль змятала ты падлогу.
Мне стала лепей, слава Богу».

Маці: *«Ідзі, дачушка, лепш, гуляй,*
Хваробы ўсякай не шукай!»

Алежак і арэшак

Ходзіць тоўсценькі Алежка,
Цэлы дзень ён есць арэшкі.
З'еў адзін, бярэ другі.
Паміж імі – пірагі.

Цэлы дзень жуе, жуе,
Дыхнуць зубкам не дае.
Раптам раздалося: «цок!»
Аб арэх зламаў зубок.

Маці кажа: «Што, сыночак,
Мышцы аддадзім зубочак?
Забярэ яна старэнькі,
*А табе дасць маладзенькі».

Варона

Важна ходзіць на дварэ,
Носіць моднае карэ.
Яе клічуць Караліна,
Яна страляе з карабіна.

Раз'язджае ў карэце,
Нібыта грае на кларнэце.
Варона знае каратэ,
І танцуе ў вар'етэ.

Скача добра кар-канкан
На смех качкам і курам.
Крычыць варона: «Кукарэку!
Ішоў бы, пеўнік, ты на рэку!

Кукарэку, кукарэ!
Генерал я на дварэ!!!»
Што ўбачыць – то крадзе,
Узяла банк у Карагандзе.

Пакруцілася ля трону,
У Рыме выкрала карону.
Варона: *«Карр-алевы, карр-алі,*
Вы такія куркулі!

Што рабілі вы калісьці,
Толькі каб не для карысці?
Мы жывем хоць на грашы,
А ўсё робім ад душы».

Варона грае добра ў карты,
Картавіць смешненькія жарты:
«Сохне ў полі каравяк,
Карова танчыць кракавяк».

Гарны ў яе картуз,
Яна матае ўсё на вус.
Варона: *«Знай казырную варону,*
Мне чыхаць на забарону!
Кожны знае карапуз,
Мечаны ў мяне ёсць туз.
Я Варона-Кармінатар,
Залячу хоць за экватар.

Мне не трэба карбюратар,
І таксама кар-кулятар.
Паважаю я гламур,
Накрапала манікюр.

З мяне малююць кар-карціну,
Усе запомняць Караліну.
Не трэба мне карыкатур!
На караблі я еду ў тур.

Паплывем на Кардыльеры,
Мае жывуць там кавалеры.
У Карэлію, Карыбы,
Там такія краявіды!

У Карпаты ды Карэю,
Ад Вар Карлавых дурэю.
Гэты горад – для варон,
Жыве барон там Каркарон.

Яшчэ станем у Мадрыдзе,
Пабываем на карыдзе!
Едзем разам на Канары,
Будзем там курыць цыгары!

Будзем разам у Бруселі
Круціцца мы на каруселі.
Вось вярблюдаў караван –
Ён ідзе ў Кыргыстан.

Варона села на карме:
«Гэй, скрабіце да мяне!
Я скажу вам карацей:
Сумна жыць мне без падзей.
Калі хочаце прыгод,
Дык глядзіце лепш за борт.

Дзядзя Гена-кракадзіл,
Ты б схаваўся лепей у Ніл.
Калі будзеш нас пужаць,
Буду па табе страляць».

Крычыць варона Карабасу:
«Адрэжу бараду адразу!»
Прыбылі мы разам у Кракаў,
Варона: *«Гэй, карчмарка, піва з ракам!*

Найлепшае нам падавай,
Самы смачны каравай,
Карпа нам і карнішоны,
Карася і шампіньёны.

Падавай усім карамель,
Я частую карабель!
Выдаем мы выкрунтасы –
Кракаўскія нам каўбасы!»

Толькі крыкне качка: «Крак!»
Усе танцуюць кракавяк.
Кружыць, кружыць карагод,
Хутка будзе Новы год.

Варона: *«Пакуль не высах каравяк,*
Будзем танчыць кракавяк!»

Як судзілі Жырафу



«Ты аглобля, жэрдка, «жыр»
І нязручны пасажыр, –
Усяк гавораць на Жырафу, –
Кран пад'ёмны. Даць ёй штрафу!»

Што ты, доўгая, зрабіла?
Галавою сонца збіла!
Сонца ўпала на луну,
І цяпер нам не да сну.

З-за цябе мы, міс Шлагбаум,
Атрымалі поўна траўм.
Лепш ляжала б на зямлі,
Мы б цябе нейк абышлі!»

Тонкім галаском Жырафа:
«Ні за што даеце штрафу!»
Языкам гаворыць злым:
«Не павінна я ні ў чым,

Не знасіць мне галавы.
Пайшлі разам да савы!»
Да савы прыйшлі судзіцца,
Як і ўсім, саве не спіцца.

І яна выносіць шалі.
Кажа: «Шалі паказалі –
Выйшла непаразуменне,
Сонца рэдкае зацьменне.

Хоць і рост твой метраў сто,
Штраф даваць няма за што.
Усё на гэтым – непавінна.
Ты прабач усіх, жардзіна!»

Сонца выйшла і заззяла.
Як ранней, нам добра стала.
Паважаюць ўсе Жырафу,
Не даюць ёй болей штрафу.

Ад чаго ж яна сумуе,
Калі крыўдных слоў не чуе?

Пяе ветрык



Пяе ветрык у лесе. Ціха,
На дварэ ўжо адліга,
Ад зямлі ідзе ўжо пар,
Будзе сеяць гаспадар.

КАЗАЧКІ

Неразумны парсючок

I

Слухай, дзетка, калі ласка,
Вось такая выйшла казка.
Неяк ладны парсючок
Выйшаў ціха на лужок.

І гаворыць парасятка:
«Не ўказ мне свінаматка.
Я адзіны з парсюкоў,
Што не слухае бацькоў.

Хачу свет заваяваць,
У ім адзіны кіраваць».
Кажа здзіўленая маці
Неразумнай парасяці:

«Раскажы ж ты мне хаця,
Як ты пойдзеш у свет, дзіця?
Як ты будзеш у свеце жыць,
Калі толькі стаў хадзіць?

Капыты твае слабыя,
Лыч нічога не нарые.
І мазгоў менш, чым у куры,
Кожны звер цябе абдурыць.

Хочаш ты валодаць светам?
Хіба шчасце толькі у гэтым?»
Парсючок маўчаў, як сыч,
І ўцек, задраўшы лыч.

II

І пабег у свет парсюк.
Выйшаў ён на дзіўны луг,
А вакол – гуляе лета,
Водар ад духмяных кветак!

Недзе там цячэ рака,
І ўбачыў ён быка.
Парсючок: *«Вось дык звер: карова быццам,*
Мяне нават не баіцца?»

«Вось цікавы пятачок, –
Кажа парсюку бычок, –
Смешных я такіх не бачыў,
Будзеш мне служыць, – зазначыў, –

А не будзеш паслухмяны –
Завяду цябе да мамы».
Парсючок: *«Слухай, дзіўная карова,*
Я скажу табе два словы:

Розум свой ты дзе забыла?
Хіба вымя дзесь згубіла?
Я не слухаю бацькоў,
А паслухаю кароў?!

Дык вось: вымя каб знайшла,
Малака мне прынясла!
Я ж пайшоў гуляць па свеце,
Пакуль сонейка ў леце».

III

Адпачыць парсюк прысеў,
Як аднекуль выйшаў леў.
Парсючок: «Што за вельмі дзіўны кот?
Лысы ўвесь, спіна, жывот,

Ды з касматай галавою,
Ганарыцца сам сабою!»
Кажа леў: «Я ў свеце цар,
І табе я гаспадар!

А не будзеш мяне слухаць,
З'ем цябе я, аблавухі!»
Парсючок яму ў адказ:
«Кот аблезлы – мне указ?!

Я не слухаю бацькоў –
Буду слухаць тут катоў?!
Жалудоў мне прынясеш,
Калі хочаш, сам паеш.

І каб грыву мне падстрыг,
А не зробіш – дам пад дых. –
Кажа, гледзячы ў твар, –
Я цяпер у свеце цар!

Забяру тваю карону,
Пакуль цэлы – марш дадому!»
«Вось дык смех – парсюк з каронай!» –
Раскрычалася варона.

Выйшаў парсючок на трон,
Быццам свету чэмпіён.
І загад усім чытае,
Што яго нішто не дбае,
Будзе ўсё, як мае быць.
Парсючок: *«Вы павінны мне служыць!!!»*

IV

Тут выходзіць з лесу ліска,
І гаворыць па-англійску.
Модная на ёй спадніца,
Залатыя завушніцы:

«Hello, pig! How do you do?
Лепш я пана не знайду.
Ты з усімі пасварыўся
І сабой заганарыўся.

Але добра, так і быць,
Буду я табе служыць.
Усё зраблю, што загадаеш,
Асалоду атрымаеш

Ад таго, як я слугую,
Не спаткаеш больш такую.
Самы ладны парсючок –
Лепшы ў свеце сябручок.

У цябе пятак, як гузік,
Як ідзеш – трасецца пузік.
І вушамі лапаціш,
Што, здаецца, паляціш.

На баку татуіроўка,
Ці прысохла то вяроўка?
Я табе хачу прызнацца:
Ты такая Piggi-цаца!

Кожны ведае камар:
Наша Piggi – superStar!!!
Хочаш смачных жалудоў?
Да мяне пайшлі дамоў».

Парсючок развесіў вушы,
Розум стаў яго не дужы.
Ён ідзе, як скажа ліска:
«Тут цішэй, тут вельмі слізка.

Тут цябе я пранясу,
Ногі не мачы ў расу».
Выйшлі да нары яны:
Поўны жалудоў збаны,

Мёд, авёс, грыбы, арэхі –
Вочы ў парсюка пабеглі –
Самай рознай саланіны.
Ліса: *«Не хапае мне свініны.*

Нешта я не так сказала.
Я хачу паесці сала.
Вой, ізноў кажу не так.
Ты прабач мяне, пятак!»

Яму лье яна віно
І паказвае кіно.
Кожны раз гаворыць: «Please».
Гэта зброя хітрых ліс.

І танцуе, і гарцуе,
І ў пятак яго цалуе,
І адмыла брудны бок,
А парсюк усё чмок і чмок.

Парсючок: *«Лепш мяне глядзіш за маці!»*
Ці ёсць розум ў парасяці?
Вельмі смачна ён паеў
І ад радасці змарнеў.

Бачыць сон ён каляровы,
Чуе ў сне матулі словы:
«Я цябе, сынок, знайду,
Трапіў, мілы, ты ў бяду».

Ён ад гэтых слоў прачнуўся –
У палоне апынуўся.
Звязаныя лыч і ногі,
І лісы ўжо голас строгі.

V

Выйшла маці на лужок:
«Дзе ж ты, дзе ж ты, мой сынок?
Ты на што пайшоў галодны
Вандраваць у свеце цёмным?

Лес ля дома, блізка рэчка –
Дзе ты знойдзеш лепш мястэчка?
Раніцай спявае салавей
Сваю песню для свіней».

Чуе сэрцам, чуе маці,
Што не добра парасяці.
І бяжыць, не чуе ног:
«Дзе ж ты, дзе ж ты, мой сынок?»

Папыталася ў быка,
Бык дае ёй малака:
«Твой сынок гарэзны нейкі,
Розныя гаворыць здзекі».

Маці: *«Штосьці ты мне хлусіш, бык,*
Шкодны ў цябе язык».
Тут сустрэўся маці леў,
Плача: «Я яго не еў.

Парсючок твой злосны нейкі
І адны гаворыць здзекі.
І карону адабраў,
Грыву стрыгчы загадаў.

Я скажу як цар прыроды:
Нарабіў твой хлопец шкоды».
Маці: *«Слухай, ты, што ў свеце першы,*
Мой сынок чытае вершы

Пра рамонак, васілёк,
Ён пакрыўдзіць вас не мог».
І пытае маці ў дрэў:
«Можа, парсючок тут еў?»

І пытае ў травы:
«Пра яго не чулі вы?»
І пытае вецярок:
«Падкажы мне, дзе сынок?!»

І ў адказ гавораць ўсе:
«Ты б не верыла ліcе,
Ты хутчэй бы паспяшала,
А то зробіць з хлопца сала».

VI

Кажа ліска: «Усё, парсюк,
Не ўцячэш з маіх ты рук.
Зараз я цябе паважу,
Потым на агні засмажу».

Той не ведае, як быць,
І ад жаху ўвесь дрыжыць.
Да лісы прыбегла маці.
Грукаціць, каб чулі ў хаце.

І спужалася тут ліска,
І забыла пра англійскі:
«Хто прыйшоў там, што за ён?
Маці кажа: «Паштальён.

Бандэроль да вас ад воўка
І цікавая паштоўка».
Ліса: «Ну, і што там ад ваўка?»
Маці: «Я прынесла парсюка.

Таго, што, кажа, свету цар
І ўсім нам гаспадар».
Ліса: *«Нешта блытае ваўчок,*
У мяне ж той парсючок».

Маці: *«Вам патрэбна распісацца,*
Жартавала я, за зайца».
Ліска вылезла з нары.
Маці: *«Зайца на, трымай, бяры».*

Атрымала ў хвост і ў бок
І ляцела з усіх ног.
Развязала маці сына,
Вось жалобная карціна.

Плача ціха свінаматка:
«Маё ж мілае дзіцятка,
Як бы ў свеце ты пражыў,
Калі б ты бацькоў забыў?»

Словы мацеры, як пытка.
Парасяці стала брыдка,
Апусціў чырвоны нос
І стрымаць не можа слёз:

«Ты прабач мяне, матуля,
Больш за ўсіх цябе люблю я.
Роднага люблю я тату.
Калі пусціш зноў у хату,

Не ўцяку ад вас ніколі,
Стану лепшы я ў школе,
Будзеш мною ганарыцца,
Больш не буду я сварыцца.

Што ж ізноў намоклі вочкі?»
Маці: *«Я ад радасці, сыночак!»*
Зразумела парасяці:
Усіх мацней – каханне маці.

Маці любіць і ліхое,
І неразумнае такое,
Усё адно ж – яе дзіцятка.
Напячэ яна аладкаў,

Дзеткі бегаюць вакол,
Сядуць разам ўсе за стол.
Няма шчасця больш у свеце,
Калі разам бацькі, дзеці.

VII

Увесь свінны гуляе хлеў,
Прыйшлі ў госці бык і леў.
На ўвесь свет ідзе гамонка,
Плачуць, то смяюцца звонка.

Сёння ў гэтай хаце свята,
У доме ўсе іх парасяты.
Пілі, елі, хрукацелі,
Разам з салаўём запелі –
Атрымаўся слаўны хор.
Воўк ледзь у лесе не памёр.

Казачка пра песцік і тычынку

I

Жыла-была адна прынцэса
У бацькоўскім замку каля лесу.
Даўно памерла яе маці
І гадаваў адзіны бацька.

І вось, аднойчы, пасля балю
Да таты дзеўчыну пазвалі.
Бацька: *«Мая каханачка, пястушка,*
Мая маленькая дачушка!

Як трэба для тычынкі песцік,
Патрэбны і жаніх нявесце».
Прынцэса: *«Тата, песцік і тычынка!*
Я не маленькая дзяўчынка!»

Бацька: *«Табе ўжо дваццаць год вось-вось,*
Да нас засватаўся Савось.
Прынцэса: *«Савось? Хто гэта? Сын савы?*
Яго ж не убачыш з-за травы!

Ён ходзіць з торбай ці з «авоськай»,
Таму завуць яго Савоськай?
Ці, можа, ён жуе авёс,
Таму і клікаюць Савось?»

Бацька: *«Савось – вядомы пан палескі*
І хлопец ён такі някепскі.
Ён разумны ўжо занадта,
З нашай бульбы робіць нафту.

Ты ведай, з гэтым хлопцам, Ядзя,
Мы будзем усе ў шакаладзе.
Хоць гэты, можа, зробіць дзедам,
Яго пазваў я да абеду».

Прынцэса: *«І не заві, з'ядзім ўсё самі!*
Дзяцей каб звалі савасямі!
Ці будуць клікаць савяняты,
Ці дзеці беларускай нафты!»

Бацька: *«Ты ўсе мне выела вантробы,*
Ніхто табе не даспадобы.
Кажаш: прынц нямецкі Ёхан –
Ён таўсматы, быццам бохан.

А прынц арабскі Мухамед
Увесь закручаны ў плед.
А прынц шатландскі Эндзі Горам
Надзеў спадніцу – нейкі сорам!

Грузінскі прынц стары Георг –
Па ім даўно ўжо плача морг.
А прынц іспанскі Тэадор –
Чырвоны, быццам памідор.

А вось польскі пан Кастусь
Даўгашыі, быццам гусь.
Прынц ізраільскі Іосіф
Нешта ўсё шукае ў носе.

Прынц галандскі Дамінік
Падышоў і раптам знік.
А балгарскі прынц Філіп –
Той да нечага прыліп.

Украінскі прынц Міхайла
Толькі думае пра сала
І салярый як купіць –
Сала смачненька капціць.

Прынц расейскі Елісей
Кажа: «Налівай ды пей».
А прынц эстонскі Урмас Струла,
Пакуль прадставіўся – заснула.

А прынц Кубы дуе губы
І не любіць нашай бульбы.
А прынц чэшскі
Носіць чэшкі.

Крыстафер – той вельмі сумны,
Робін – надта ўжо разумны.
Карл у каханні прызнаецца,
Педра ўвесь час смяецца.

Тодар вершыкі чытае
І раз-пораз пазяхае.
Лі – той з вузкімі вачыма,
Кожны раз праходзіць міма».

Прынцэса: *«Спадабаўся мне Сімон –*
Сяброўка ўзяла ў палон».
Бацька: *«Ведаеш, мая ж Ядвіга,*
Ад цябе ў мазгах адліга.

Ад тваіх ужо выкрунтасаў
Жаніхоў няма запасаў».
Ядзя кажа, сцяўшы зубы:
«Едуць сватацца з-за бульбы.

Толькі ў нашым родным краі
Расце бульба залатая.
І ўся замежная бядната
Ідзе да райскага балота.

На мяне ты, тата, давіш,
Па каханню выйду замуж!
Трэба мне такі жаніх,
Каб ён лепшы быў за ўсіх.

Хоць босы ходзіць па расе,
Але каб не такі, як усе».
Бацька: *«Хіба з простага народу,*
Нейкі ёсць яшчэ за бродам.

Кажуць, слаўны хлопец Зміцер,
Тры разы ён ездзіў у Піцер.
Ніц-ніцам у яго нічога.
Хаціна – быццам бы бярлога,

Саломай крытая страха –
Такога хочаш жаніха?
Лепш не знойдзеш сваяка,
Чым такога бедняка».

Прынцэса: *«Ведаеш, хачу такога,*
Няхай і хатачка-бярлога,
Няхай хоць будзе самы горшы,
Але каб не любіў за грошы.

Няхай хоць бедны будзе, голы,
Альбы ён быў заўжды вясёлы».
Бацька: *«А чаму ж не весяліцца,*
Калі зубы на паліцы?

І чаго тут сумаваць,
Калі зубы ляскаціць?»
І пайшла за брод дзяўчына,
Бедны дзе жыве хлапчына.

Што ўзяць, калі бядняк?
Але ўсё зусім не так.

II

Вядома, мачаха Каміла
Дзяўчынку вельмі не любіла.
Каміла: *«Ты доўга будзеш яе песціць?*
Падлогу не умее месці!»

Бацька: *«Ты хочаш, каб мая дачушка*
Стала нейкай папялушкай?»
Каміла: *«Твая разбэшчаная песта*
Не намяшае нават цеста!»

Бацька: *«Добра, ты нешта мяшаеш!*
Ці нас со свету зжываеш?»
Ад караля жанчына моўчкі
Рабіла розныя прымочкі,

Каб з дому дзеўчына сышла
І з імі разам не жыла.
І караля таксама сплавіць –
Адной у каралеўстве правіць.

Яна што хочацца рабіла
І толькі подласці чыніла:
З замежным панам – на спатканне,
Са світай – у лес на паляванне.

І гэта жонка караля
Падбіла неяк жураўля.
А птушку выхадзіў хлапчына,
Быццам родненькага сына.

Вось такі ён, той Змітрок –
У душы у хлопца Бог.
Каб стаў здаровы журавель –
Клаў у чароўную купель.

У ваду і травы, і настоі,
Даваў яму свае напоі.
Прайшоў усяго адзін дзянёк –
І паляцець жураўлік змог.

Змітру гаворыць журавель:
«Прасі што хочаш за купель,
І за сваё выратаванне
Гатоў я выканаць жаданне».

Змітрок: *«Жаданне – не пустыя словы,*
Няхай усе будуць здаровы!»
Журавель: *«Прасі што-небудзь для сябе!»*
Змітрок: *«Каб людзі не жылі ў журбе».*

Журавель: *«З табою не дагаварыцца,*
Але, каб нам не пасварыцца,
За сэрца добрае, хлапчына,
У падарунак – журавіна.

Ты ведай, з гэтай журавінай
Стаць багачом табе магчыма.
Быць багацейшым самым у свеце
Ці ёю ратаваць ад смерці.

Вось выбар стаў перад табою.
Ты сам адчуеш усё душою».
І навіна пра журавіну
Дайшла да караля жанчыны.

І выдае ўказ Каміла,
Каб світа ягаду здабыла.
І едзе рана ставіць світа
Капкан, каб трапіў у яго Зміцер.

А сябар Зміцера – кажан –
Аднёс да замка той капкан.
Паклаў пад царскі стол у садку,
А сам схаваўся ў цяньку.

III

Жыў за бродам нехта Зміцер,
Сапраўды, ён ездзіў у Піцер.
Хоць запраўляў у штаны ён світар,
Але ведаў многа літар

І замежных розных моў,
Вучыў пісьменнасці кароў.
Карове кажа: «Mon amour!»
У адказ яму карова: «Му!»

Карове кажа ён: «Bonjour!»
А тая зноў гаворыць: «Му!»
Ходзіць хлопец па лясочку
І яму ня спіцца ночкай.

Няма часу для сябе:
Калі недзе хто ў бядзе –
Ён усім дапамагае,
Лепшай долі не чакае.

Капусту пасадзіў ля хаты –
Пацягалі ўсю зайчаты,
Вішні смачныя – шпакі.
<u>Змітрок:</u> «Ешце, ешце, сябрукі!»

Ведаў песцік і тычынку,
Кожную любіў лічынку.
Кожны ў лесе павучок
Ведаў, хто такі Змітрок.

Акуляры на ўсім твары,
Быццам у камбайна фары.
Нехта скажа: «Разяваты!»
Але кожнаму ён рады.

I V

Прынцэса: *«Я адна за брод іду,*
Каменні кідаю ў ваду».
І трапляе жабе ў бок –
Жаба дуе пузырок.

Піў гарбату таракан –
Смецце кінула ў стакан.
Без роздуму ўсё шкоду чыніць –
Збіла палкай павуцінне.

І за гэта павучок
Ядзьку закруціў у клубок.
Прынцэса: *«Вас непрыемнасці чакаюць,*
За мяне вас пакараюць!»

І смяюцца мошкі звонка:
«Будзе ўсё, як скажа пчолка.
Яна з пасекі ляціць,
Чуеш, як яна гудзіць?»

Прынцэса: *«Не, нічога я не чую*
І вас бачыць не хачу я.
І мне свет ваш невядомы,
Шукаю хату я з саломы!»

Пчолка: *«А я пчолка, жу-жу-жу,*
У вулей я нектар нашу.
Дзе жыву – не раскажу,
Мёд табе не пакажу,

Не чапай, бо укушу,
У свой вулей не пушчу!»
Прынцэса: *«Не патрэбны мёд мне, пчолка,*
Адкажы мне лепей, Зорка,

Дзе жыве нехта Змітрок,
Самы бедны хлапчучок?»
Пчолка: *«Ну, ты скажаш, самы бедны!*
Сэнс ад тваіх слоў дарэмны!

Скажу так, што той Змітрок
Дзеля нас сапраўдны Бог.
Уся забродная аколіца
На Змітра аднога моліцца!

Ад яго табе што трэба?
Адразу бачу, што не хлеба!
Хочаш стаць яго Багіней?
Не. Такую ён пакіне.

На сябе калі глядзела?»
Прынцэса: *«Тварам ладная і целам!»*
Пчолка: *«У галаве духі, спадніцы,*
А душа без таямніцы.

Трэба паглядзець, магчыма,
На свет іншымі вачыма.
Дам табе, мая дзяўчынка,
Свае вочы на хвілінку».

І ўбачыла прынцэса:
Іншым стаў зусім узлесак.
Вакол поўзаюць жучкі,
Мурашкі, мошкі, павучкі.

Між сабою размаўляюць
І дабра ўсім жадаюць.
Апынулася дзяўчынка
У свеце песціка з тычынкай.

І ўзяла сама пылок,
Выравіла свой мядок.
І ад шчасця ўзляцела:
«Я цяпер усё зразумела!

Вось які ён, свет чароўны,
Усякіх розных гукаў поўны!
Вакол столькі прыгажосці
Няма месца ў свеце злосці!

Але нельга крыўдаваць,
Хачу з вамі сябраваць!»
Пчолка: *«Раз цяпер такія мары,*
У падарунак – акуляры,

Колер светленькі ружовы.
І дзякуй за такія словы.
Там, за бярозай, стаіць скрыня,
Адчынеш – а ў скрыні дыня.

Унутры верацяно,
Да хлопца прывядзе яно».
Скрыню дзеўка адчыніла,
Узяла дыню, падзяліла.

Тараканy дала, пчолцы,
Жабе, павуку па дольцы.
Жаба грае на губе:
«Ты забыла пра сябе!»

Прынцэса: *«Вось цяпер я буду знаць,*
Як прыемна частаваць!»
І кружыць верацяно,
І саткала палатно.

Верацяно: *«Вось табе на ўсё жыццё*
З траў духмяных палатно.
З ім, – расказвае дзяўчыне, –
Станеш лепшай гаспадыняй.

Усё, хадзем, няма мне часу,
Да Змітра пайшлі адразу».
Ішла за ім дзяўчына доўга,
Бо ж не роўная дарога.

То панюхаць трэба кветку,
Пакуль цвіце яшчэ ўлетку,
Паздароўкацца з лісою,
З кабановай чарадою.

З кожным ўсякім пяць хвілін.
Верацяно: *«Не туды прыйшлі зусім!*
Трэба нам ісці назад.
Добра хоць, што часу шмат».

Пакружылі разоў дзвесьце,
Да Змітра прыйшлі нарэшце.
І ўбачыў ён дзяўчынку:
«Вось цікавая тычынка!»

І яна стаіць на месцы:
«Вось які цікавы песцік!»
Сталі моргаць акуляры,
Быццам у камбайна фары.

Левы, правы паварот,
Кружыць, кружыць карагод.
І, стаміўшыся з дарогі,
Яму ўпала дзеўка ў ногі.

Ён занёс яе да хаты,
З траў сваіх зрабіў гарбаты.
Дзеўчына напоі п'е,
Кажа: «Быццам я ў сне.

Ну, які ты гаспадар!»
І цалуе хлопца ў твар.
І ружовы акуляр
Загарэўся, як ліхтар.

Пацалунак спадабаўся,
Хлопец моцна закахаўся.
І звяртаецца да песты:
«Ядзя, будзь маёй нявестай!»

Быццам арэол між іх.
Прынцэса: *«Зміцер – мой цяпер жаніх!!!»*

V

Каміла з каралём тым часам
Елі ў садку каўбасы.
Былі таксама і прысмакі:
Мачанка, дранікі і ракі.

Каміла: *«Мой залаценечкі, Яўген,*
Найлепшы ў свеце, «superman»!
Чароўны вось табе напой,
(І будзе вечным твой спакой!)

Мы вып'ем, мілы, за каханне!»
Сама – амаль ужо ў капкане.
Яўген той кубак уздымае,
Каміла ў капкан трапляе.

Кароль, каб жонку супакоіць,
Сваёй травой хацеў напоіць.
Каміла: *«Я атруту піць не буду!»*
Бацька: *«Дык ты давала мне атруту?!»*

А Каміла кроў губляе
І зусім ужо памірае.
Паляцеў за брод кажан,
Змітру кажа пра капкан.

Хлопец лекі стаў збіраць,
Каб жанчыну ратаваць.
Да яе прыйшоў хлапчына,
Даў ад смерці журавіну.

І паднялася Каміла,
Адразу ж пра дабро забыла:
«Усё. Я з'ела журавіну.
Цяпер я ваша гаспадыня».

Усе з яе смяюцца зверы:
«Гаспадыні мы не верым!
У нашым лесе і дарэмна
Вось такая не патрэбна.

Даравалі ёй жыццё,
Яшчэ выслухай ныццё!»
Прыляцела ізноў пчолка:
«Ад тваіх слоў неяк горка.

Трэба паглядзець, магчыма,
На свет іншымі вачыма.
Дам табе, мая жанчынка,
Свае вочы на хвілінку».

І Каміла стала пчолкай.
Каміла: *«Не хачу быць болей жонкай!*
Мяне гэта так цікавіць,
Што людзей змагу я джаліць!»

Да Яўгена падлятае,
У сэрца джала выпускае.
Каміла ўпала і памерла,
Бо жыць па-людску не хацела.

У караля ўзняўся жар,
І гарыць ён, як ліхтар.
Стала Ядзя на калені:
«Татачка, жыві, міленькі!»

І прыносіць журавель
Чароўну Зміцера купель.
Выхадзілі караля,
Як калісьці жураўля.

Каміла: *«Я за сваё выратаванне*
Гатовы выканаць жаданне.
Прынцэса: *«Жаданне, татачка, адно:*
Хацеў унукаў ты даўно,

Таму не трэба нам журыцца –
Хацеў Змітрок на мне жаніцца».
І гаворыць дзік касматы:
«Усё. Ідзем да вас мы ў сваты!

Усім забродам гадавалі,
Каб цяпер за так аддалі?!»
Бацька: *«Няма куды ад вас падзецца –*
Аддаю вам каралеўства.

Будзем жыць мы разам у замку,
Пець буду ўнукам калыханку!»
Тут выходзіць барсучок:
«Ты пакінеш нас, Змітрок?»

Падыходзіць сумны вожык:
«Я табе грыбоў дам кошык!»
Выйшаў і мядзведзь са скібкай:
«Як, Змітрок, табе не брыдка?

Будзеш жыць, як пустадомак,
У замку нейкім невядомым.
А сад твой больш не зацвіце,
Не пройдзеш босы па расе.

Не возьмеш у ручанькі зямліцы,
Не пап'еш вады з крыніцы».
Над Змітром вавёрка ўецца:
«У замку згубіш сваё сэрца!»

Выйшаў Зміцер на калоду,
Кажа сваяму заброду:
«Свет настолькі наш прыгожы,
Не купіць яго за грошы.

Ты нас, Бацька, выбачай,
Не пакінем мы свой рай.
Нам не трэба каралеўства,
Каралеўства – наша сэрца!
Будзем жыць у хаціне разам –
Гэта будзе лепшым часам!»

Паслухмяныя і не

I

Жылі-былі ў адным сяле
Паслухмяная і Не.
Родныя яны сястрыцы,
А як быццам чужаніцы.

Паслухмяна ўстае рана,
Слухае, што скажа мама.
Робіць усякую работу
У завіруху, дождж, спякоту.

Абуе дзеўка чаравічкі –
Ідзе рана па сунічкі,
У небе месячык і зоры –
Паслухмяна тчэ ўзоры.

Паслухмяная: *«Выйдзе ладны рушнічок –*
Такім і будзе жанішок».
А Не лянуецца на печы,
Адляжала спіну, плечы.

Толькі то і робіць Не,
Што спявае на вакне:
«Цэлы дзень сабе свішчу,
Маці слухаць не хачу.

Кут мой мілы, мой прыгожы!
Цябе забыць, дзе ўзяць мне грошы?»
Маці кажа неяк Не:
«Памажы, дачушка, мне.

Я і грошай дам табе,
Каб не грала на губе».
Не: «Зарабляць? Так не патрэбна!
Давай мне грошыкі дарэмна!»

Маці поплісу бярэ,*
Па плячах дзяўчынку б'е.
Пісягі ўжо на спіне,
А ўсё адно гаворыць: «Не!»

Маці: «Усё сяло з цябе дзівіцца,
Якая ж ты сараматніца!»
Не: «Каб сорам не пераживаць,
Пайду сябе ў жыцці шукаць,

А без мяне вам будзе лёгка,
Я ж паскакала, як вавёрка».
А маці дзеўчыну кляне:
«І не прыходзь дадому, Не.

І ты мне болей не дачка», –
Зляцеў праклён услед з языка.

**Попліса – ручкі ад торбы, пояс.*

II

У другім сяле непадалёк
Жыў Працаўнік ды Абібок.
Яны – два родныя браты,
А быццам розныя сваты.

І была ў Працаўніка
Вельмі лёгкая рука:
Што ні пасадзіць – ўсё расце,
Сто памідораў на кусце.

Зарань устане Працаўнік –
Вядомы ён у сяле грыбнік.
А гэтым часам Абібок
Салодка спіць, ўсё чмок ды чмок.

Устае ўпоўдзень Абібок,
Пазяхае, чэша бок.
Збярэ сяброў сваіх ля лаўкі
І цэлы дзень ім чэша байкі:

«Я нарадзіўся ў час абеду,
Як не было на свеце дзеду.
А бацька мой лятаў у космас
Купіць дзяшовых папяросак.

І бачыць – нейкі хлопчык блудзіць,
Спытаў: «Лунацік, пойдзеш у людзі?»
З ім паляцеў я на калясцы,
У нейкай каляровай касцы.

Пры павароце на Венеру
Сустрэлі нейкую «талеру».
Крычу я ім: «Бі-біп, у бок!» –
Таму празвалі Абібок».

А Бацька яго пугай лупіць:
«Сынок, з цябе ж смяюцца людзі!
Пайшоў вон з хаты, лежабок,
Ты мне не сын больш, Абібок!»

Але зусім гэта не сон:
Сказаў ён сыну ўслед праклён.
<u>Абібок:</u> *«Каб не было за сына горка,*
Чакае, знаць, мяне вандроўка

Праз завіруху, снег, завею:
Знайду я тых, хто зразумее…»

III

На ганку плача ціха маці:
«Сароміцца свайго дзіцяці?!»
«Са злыднем можа ён сустрэцца, –
Стучыць ад жаху ў Бацькі сэрца, –

Чаго сароміцца? Смяюцца?
Да сына больш не дакрануцца!
Як быццам сонейка не свеціць.
Мне больш сыночка не папесціць?!»

IV

Ад родных ніў у адзін дзянёк
Сыйшлі і Не, і Абібок.
І вось на нейкім скрыжаванні
Дзяцей адбылася спатканне.

Убачыў Абібочак Не –
Пайшлі мурашкі па спіне:
«Якая смешная дзяўчына,
Гаворыць «не» без дай прычыны,

Свісціць чагосьці і смяецца…
Яна мне трапіла ў сэрца».
Прыкмеціла і Абібока дзеўка:
«Цябе касмічная талерка

Хіба падкінула сюды?
З твайго бы твару – піць вады.
У цябе – нябесная краса,
У мяне – да пят свая каса.

Магу я ёю і касіць,
Але ляную́ся рабіць.
Ты ходзіш ладна рукі ў бокі,
Перастаўляеш важна ногі,

І дзеўкі падаюць ў пясок,
Як ідзе міма Абібок.
Абібок: *«Ты спадабаешся мне, Не,*
Спяваць ты любіш і мяне.

Калі ў нас такі трохкутнік,
Ці не стварыць фолк-гурт нам «Трутні».
Прыйшоў хлапец да ганчара:
«Ганчарык, трэба мне дуда.

Няхай, міленькая, так грае
І цэлы свет за ёй спявае».
Зрабіў дуду яму ганчар,
Што, як зайграе – ідзе пар.

Пайшла дзеўка да музыкі:
«Не трэба мне ніякай скрыпкі,
Нашто, каб грала і скрыпела,
І вакол зямля ўся млела?

Дай мне лепшыя цымбалкі,
Каб скакалі нават бабкі».
Пайшлі дзеткі вандраваць,
Свае канцэрцікі даваць.

V

На фэст да іх усе бягуць
І разам танчуць і пяюць:
«Мы касмічныя піраты,
Ад мамы ўцяклі, ад таты.
Прыляцелі на талерцы,
Адчыняйце ў хатах дзверцы!

З іншага мы вымярэння,
Падавайце нам пячэнне,
Бліны, дранікі, кампот,
Бо ў нас пусты жывот.

Мы не любім працаваць,
Любім пець ды танцаваць.
Спім па дваццаць пяць гадзін,
Паспяваем – зноў паспім».

VI

І тут узняўся моцны вецер,
І чорным стала ўсё ў свеце.
І з'явіўся Чарадзей,
Зазваў ён да сябе дзяцей:

«Вы пойдзеце ў дзіцячы дом
І свой адробіце праклён.
Вы былі непаслухмяны –
І вызвалі праклён той самі.

Будзем працаваць вучыцца,
Бацькам на вас каб больш не зліцца».
З лапатай робіць Абібок,
За пальцы ўзяўся мазалёк.

Працуе разам у полі Не,
Маўчыць яна і спіну гне:
«Ты толькі не кажы нікому,
Хачу я, Абібок, дадому.

Я так цяпер шкадую мамку,
Яна заўсёды ўстане зранку,
Згатуе смачненькіх блінцоў,
А я давала храпакоў.

Ну дык і што, няхай і біла,
А як яна мяне любіла,
Ласкава скажа і пяшчотна:
«Мая Ненешачка ты родна!»

Абібок: *«І я таксама ўяўляю,*
Як свайго тату абдымаю.
Не шкадаваў ніколі бацькі,
А ён адзін, памерла маці.
Згатуе есці – проста смак,
А сынок такі лайдак!

Лажыцца спаць ён позна ноччу,
Трасецца дзень на трактарочку.
Не кожны вытрывае траску,
Яшчэ і я тут – пра каляску…
З любоўю біў мяне ён пугай,
Яго ніколі я не слухаў».

VII

Дадому піша Не лісток
І заліваецца між строк:
«Выхавацелька спявае калыханачку,
Мы плачам і чакаем сваю мамачку.

Матулечка мая, мая ты мамачка,
Патрэбна больш за ўсё твая мне ласачка.
І цацкі ўсякія, і лялькі, і падручнікі
Ніколі не заменяць твае ручанькі».

VIII

Каб гора менш перажываць,
Пайшлі бацькі дзяцей шукаць.
І вось на нейкім скрыжаванні
Бацькоў адбылася спатканне.

Маці: *«Мяне Марыя зваць, а вас?»*
Бацька: *«Мяне, як Бульбу, зваць – Тарас.*
Што, маці, нарабілі гора?
Каб не зайшлі куды за мора…

Дзе нам цяпер шукаць дзяцей,
А можа, ўзяў іх Чарадзей?!»
І тут узняўся моцны вецер,
І чорным стала ўсё на свеце.
І з'явіўся Чарадзей:
«Дык гэта я забраў дзяцей!
Яны ў маім дзіцячым доме
Спяць зусім не на саломе,

Займаюцца, працуюць у полі,
Не чулі гэтага ніколі?
Сябруюць, вершыкі чытаюць,
Вядома, лепш за ўсіх спяваюць,
І прыйдзе некалі той час,
Як дзетачкі забудуць вас…»

Маці: *«Не рві душы нам, Чарадзей,*
Скажы лепш, як вярнуць дзяцей?»
Чарадзей: *«Каб я забыў пра ваш праклён,*
Возьмеш, маці, з поля лён

І тую поплісу сатчэш,
Дачку якою сваю б'еш».
На бацьку кажа ён: «Табе –
Зрабіць са сталі пугу мне,

Якою хлопца б'еш ты, злыдзень.
На справу вашу – толькі тыдзень».
У гэты ж самы і дзянёк
Пайшла Марыя ўзяць лянок.

Але зусім гэта не сон:
Ад чагосьці вымак лён.
Да каваля Тарас ідзе:
«Зрабі стальную пугу мне!»

Каваль: *«Назад таму некалькі дзён*
Затух аднечага мой горн».
Да Чарадзея йдуць назад:
«Мы не зрабілі твой загад!»

Чарадзей: *«Марыя думала, ўсё проста:*
Паб'ю лянок, закіну ў кросны,
Што тую поплісу саткаць?
Патрэбна год цяпер чакаць».

Бацькам гаворыць Чарадзей:
«Вы сакранулі рух падзей.
Пачула неба ваш праклён,
Ліў тыдзень лівень, вымак лён.

Пачула пра праклён зямля,
Агонь забрала ў каваля.
Ідуць злачынствы, йдуць па крузе,
Канца і краю ім не будзе.

Да мора дойдзе, паміж намі,
Тады ўзнімецца цунамі,
Пайдуць пад воду гарады,
Рабіць што будзеце тады?»

Маці: *«І добра, што не чула мора,*
А то было б такое гора!
Дапамажы нам, Чарадзей,
Спыніць злачынны круг падзей».

Чарадзей: *« Каб дараваў вам гэта свет,*
Стварыце гурт ці фолк-дуэт.
І трэба так, бацькі, зайграць,
Каб вас прыйшлося шкадаваць.

Тарас ідзе да ганчара:
«Патрэбна мне, ганчар, дуда».
Пайшла маці да музыкі:
«Дай мне самай звонкай скрыпкі».

Спалі мала, жылі ў лесе,
Усё ж стварылі яны песню.
Каб дзяцей выратаваць,
Дык навучышся лятаць.

Чарадзея зноў дазвалі,
І жалобна заспявалі:

«Як няма дзяцей – пакута.
Страва ўсякая – атрута.
Вяселле, грошы,кірмашы
Не патрэбны без душы».

Бацька: *«Я зайграю ду-ду-ду,*
Забудзьце, дзетачкі, крыўду».
Маці: *«Грай, міленечкая скрыпка,*
Раскажы бацькам, як брыдка.

Вянуць каля хаты кветкі,
Бо не йдуць дадому дзеткі.
Як цяпер без вас нам жыць,
Хто нас зможа пасмяшыць?

Навучыліся мы граць,
Каб вы змаглі нам дараваць.
Даруйце, родныя, даруйце,
Наш боль, міленькія, пачуйце!»

Плача сумны Чарадзей:
«Не аддам я вам дзяцей.
Каб я прабачыў вам і свет,
Апошні напісаць куплет
Патрэбна дзецям мінавіта,
І будзе пра праклён забыта».

IX

А Абібок і Не тым часам
Таксама пелі песню разам.

Абібок: *«Я зайграю ду-ду-ду,*
Татачка, забудь крыўду».
Не: *«Раскажыце ўсім, цымбалкі,*
Пра маю любоў да мамкі.

Не патрэбны мы нікому,
Хочам мы хутчэй дадому.
Самых цёплых, добрых слоў
Пачуеш толькі ад бацькоў.
Навучыліся мы граць,
Каб вы змаглі нам дараваць.
Даруйце, родныя, даруйце.
Наш боль, міленькія, пачуйце!»

Эпілог

І скранулася зямля,
Агонь узнік у каваля.
Сышоў з зямлі зусім праклён,
І вырас новы, ладны лён.

Бацькі ж убачылі дзяцей,
Ім не патрэбны Чарадзей.

БАЕЧКІ

Знакаміты мядзведзь



I

Ішоў мядзведзік па ляску
Пашукаць сабе мядку.
А зязюля на суку
Таманіла: «Ку-ку-ку».

Мядзведзік: *«Што дарэмна час марнуеш,*
На суку сабе кукуеш?
Лепш прынесла б мне мядку,
А я і сам магу «ку-ку».
На галінку ён узлез
І спявае на ўвесь лес:
«Ку-ку-ку , ку-ку-ку,
Прынясіце мне мядку!»

Ваўчаня бяжыць па лесе,
А Міхась спявае песню.
Ваўчаня: *«Вось пятрушка ды цыбуля,*
Што за дзіўная зязюля?
У яе і нос кірпаты,
Ці мядзведзь гэта касматы? –
Воўка кажа Міхаську. –
Ты зусім, мядзведзь, «ку-ку»?

Ці на сонцы перагрэўся?
Ну куды ж твой розум дзеўся?»

Мядзведзік: *«Слухай, Воўка-шэры бок,*
Лепш прынёс бы мне мядок.
А пакуль ты прынясеш,
Я павыю на ўвесь лес».

Вожык шэранькі паўзе,
На калючках грыб нясе.

Мядзведзік: *«Што яшчэ ты, вожык, можаш,*
Як грыбоў прынесці?
Адказаў мядзведзю вожык:
«Я магу іх з'есці».

Мядзведзік: *«Слухай, ты, Калючка-Коля,*
Я не еў грыбоў ніколі.
Усе чапляй мне іх на бок,
Сам нясі-ка мне мядок».

Зайка – пупачкай хвасток –
Пад кустамі скок ды скок.

Мядзведзік: *«Слухай, ты, Касое вока,*
Тут да мёду недалёка.
Прынясі мне мёду скрынку,
Паскачу я сам хвілінку».

Пазбіраліся ўсе звяры паглядзець,
Як з розуму сышоў мядзведзь.
То ён вые, то кукуе,
То паскача, патанцуе,
То грыбы на бок чапляе,
З птушанятамі гуляе.
«Міхась, слухай, – кажа Дзік, –
Можа, ты ступіў на цвік?
Можа, ты паеў паганак
Ці прачнуўся вельмі рана?
З'еў бы смачных жалудоў
І пайшлі б ужо дамоў.
У бярлозе цёпла, ціха,
Ты паслухай сябра Дзіка.
Твае дзетачкі таўсматы
Цэлы дзень чакаюць тату.
Твая жонка цётка Мар'я
За цябе перажывае».
«Ішоў бы ты ў Новы Бор», –
Кажа вельмі спраўны тхор
І чытае маніфест,
Каб мядзведзь пакінуў лес.
Міхась злез, пайшоў дадому –
Не патрэбны ён нікому.
Толькі перайшоў раку,
Стаў ізноў крычаць: «Ку-ку!»

II

Пайшоў Міхась у Новы Бор…
Знаёміты стаў акцёр.
Яго носяць на руках,
Мёд прыносяць у збанах.
Яго прызналі і ў ляску:
Ёсць цяпер музей «Ку-ку».
На галіне помнік ставяць,
Яго творчасць ўсіх цікавіць.

Кожны дзень экскурсаводы
Турыстаў водзяць карагоды:
«Тут ён жыў і еў, і спаў,
На галінцы ён спяваў».
«Мы мядзведзя шанавалі,
Мёд камбайнамі збіралі.
Сам пайшоў ён у Новы Бор», –
Ціха-ціха кажа тхор.
І пытае Насарог:
«Чаго ж ён ад вас уцёк,
Калі вы яго любілі,
Мёдзік вуллямі насілі?»
І пачулі ад сарок:
«Каб любілі – дык не ўцёк…»

P.S. На цябе наставяць зброю –
А ты будзь самім сабою.

Кот і мышы

I

Як аднойчы вельмі рана
Выйшла важна мыш на ганак
І гаворыць: «Прызнаюся,
Больш ката я не баюся!

Пачынаю сёння зноў
Паляванне на катоў».
Усе вакол гавораць мышы,
Каб каты «вастрылі лыжы».

Нават крот нарыў хадоў –
Паляваццца на катоў.
Вось дык выйшла навіна –
Гэта жудасць для слана.

Вочы ён закрыў вушамі,
Хобат закруціў вузламі.
Конь іржэ, смяюцца гусі,
Парася ляжыць на пузе.

Заяц ў лесе на вяроўку
Пасадзіў самога воўка.
У бярлозе ад здзіўлення
З'еў мядзведзь усё варэнне.

Пчолы мёд не выраблюць,
Трутняў з вулляў выганяюць.
Крычыць пеўнік: «Ку-ка-рэ!
Што за справы на дварэ?»

II

На акенцы рыжы кот
Грэў пухнаценькі жывот,
Лапкаю ён чэша вуха,
Бо на вуха села муха.

Ён паважна пазяхае,
Што гаворыць мыш, – не дбае.
Але думае: «Чаму
Не пад'есці самаму?»

Узяў і выйшаў ён на ганак,
На вусах вісіць смятана.
Кажа кот: «Ну, малайчына,
Вельмі спраўная мышына!

На катоў яна палюе,
Мяне гэта так хвалюе,
Што ад гэтых хваляванняў
Не магу спаць на дыване.

Што дарэмна паляваць,
Сам прыйшоў к табе я здацца!»
І крычыць барсук з сасны:
«Я не чуў такой маны!

Ці, нібыта, гэта сон –
Кот здаецца ў палон?!»
Качкі параскрылі дзюбы,
Зайцы зноў змянілі шубы.

На дыбкі кароўка ўстала,
Бычку вымя перадала.
Напужаліся ягняткі,
Паклявалі ўсе зярняткі,

Як убачылі бычка,
Папрасілі малачка.
Парасятка ад канфуза
Бруднае памыла пуза.

Вы такой не чулі байкі –
Пеўнік сеў выседжваць яйкі!
Мыш не ведае, як быць,
І ад радасці пішчыць:

«Гэй, хутчэй бяжыце, мышы,
Сам прыйшоў да нас наш Рыжы!»
Мышы хутка наляцелі,
Узяць у палон ката хацелі.

Выйшла ўсё наадварот:
У паляванні спраўны кот.
Толькі вусам ён павёў,
Як прыбегла сто катоў.

Палавілі ўсіх мышэй
Ад хвастоў і да вушэй.
І цяпер ужо сланы
Бачаць радасныя сны.

III

Нейк аднойчы вельмі рана
Выйшаў сумны кот на ганак.
Ён звярнуўся да мышэй:
«Вывадзіцеся хутчэй!
Будзем, як раней, мы жыць:
Вы – ўцякаць, а мы – лавіць!!!»

P.S. Кот, вядома, паляўнічы.
Быць ахвярай – доля мышы.

Як Гусь і Пятрусь ратавалі Беларусь

I

На ўсю нашу Беларусь
Самы дужы пан Пятрусь.
Ён жыве ў Слуцкім краі,
Травы розныя збірае.

Слаўны хлопец, той Пятрусь,
З ім сябруе нават Гусь.
І чужое парася
Паважае Петруся.

Паважаюць яго ракі,
Усе вакол каты, сабакі.
Пятрусь з імі размаўляе,
Цешыць, смешыць, забаўляе.

Кожны ведае лісток,
Калі ў лес прыйшоў Пятрок.
Уся зямля вакол трасецца,
Бо Пятрусь ідзе з вядзерцам.

Хлопец ён добразычлівы,
І вясёлы і гуллівы.
Ведала Еўропа ўся
Пра асілка Петруся.

II

Арэ, сее, жне і косіць,
Жонцы грошы ўсе прыносіць,
Тая ж седзьма дзень сядзіць,
Яшчэ будзе гаманіць,

Глядзіць поглядам суровым:
«Там цябе чакаюць дровы,
Усе каб хораша злажыў!»
Пятрусь: *«Я ж яшчэ не еў, не піў!»*

Жонка: *«Потым ты яшчэ, асілак, два гектары заарэш,*
І тады прыходзь дадому чаго-нечага паеш».
Усё зрабіў, прыйшоў дадому
І яшчэ злажыў салому.

Кажа жонцы разоў дзвесце:
«Дзесьці сесці мне паесці?»
Жонка: *«Дзесьці сесці? Сядзеш доле,*
Крэслаў не зламаў каб болей.

Бо цябе не ўсадзіць,
Не ўсадзіць і не ўкарміць.
Я варыла парасятам,
Возьмеш у курэй зярнятак,

З таго тыдня халадзец,
Так і паясі, хлапец!»

Пятрусь: *«Вось прыемна, Леся, дзякуй!*
Буду есці, як сабака,
Ці з карыта, як свіння,
Забяру авёс у каня.

Калі стала ты такою,
То цалуйся са свіннёю.
Апранай свае панчохі
І ідзі дамоў патроху».

III

Вось такая, дзеці, жонка дасталася Петрусю,
Але больш за ўсё на свеце ён любіў сваю Гусю.
А чаго любіў так Гусю, сам Пятрусь не разумеў,
Зваў яе ласкава Дусяй, на сустрэчы з ёй ляцеў.

Дуся ж тая мілавіца,
Ну не гусь, а чараўніца.
Пер'е ўсё на ёй блішчыць,
Як такую не любіць?

Толькі весела гагоча,
Кожны раз знікае ноччу,
А пад раніцу ізноў,
Прылятае гусь дамоў.

Дусі каб людскую кроў,
Дык між іх была б любоў.
У дваіх раслі з маленства,
Маці клікала ў акенца:

«Пеця, Пеця, ця-ця-ця!»
Прыдзе Дуся і дзіця.
Калі маці паміралa,
То абодвух пагукала.

Кажа: «Вось табе зярнятка,
Маё мілае дзіцятка.
Гэта соль нашай зямліцы
І жывой вады крыніца.

Калі будзе папялішча
І вакол усё вораг знішчыць,
Ты зярнятка кінь у кроў –
І жыццё вярнецца зноў.

Ты павінен захаваці
Нашую Радзіму-маці!
А ў Дусі ёсць пяро,
Трэба ім тварыць дабро.

Хто пяром зло навядзе,
Ад таго і прападзе».
Доўга з гуссю Пятрусь плакаў.
Раптам тут завыў сабака,
І у час, у гэты самы,
У Петруся не стала мамы.

IV

Снедаў некалі Пятрусь,
Думаў ён пра Беларусь.
І ўжо на працягу сутак
Абурае хлопца смутак.

Еў ён слаба, без натхнення:
Шклянкі тры ўсяго варэння,
Шкварак тры скаварады,
Кошык агуркоў з грады.

З'еў зацірку, халадзец,
Бульбу, грэчку, селядзец,
Смачных дранікаў, мачанку,
Абараначкаў вязанку,

Халаднік з'еў ад спякоты,
Усё запіў яшчэ кампотам.
Еў ён так, без апетыту,
Кволы, стомлены, сярдзіты.

І ляціць аднекуль Гусь:
«Танс прыйшоў на Беларусь!
Наляцелі каршуны,
Нарабілі нам вайны.

І нямецкія аўчаркі
Вакол ставяць заапаркі!»
Пятрусь: *«Усявышнія айцы!*
Да мяне ж ідуць ганцы!

Вы чые?» – «Ганцы мы Танса».
Пятрусь: *«Я і бачу, што паганцы!» –*
Ганцы: *«Ты павінен, пан Пятрусь,*
Ці пакінуць Беларусь,

Ці служыць у войску Танса,
Думай і хутчэй збірайся!»
Не пытаў Пятрусь, што, дзе,
Адразу ж даў па барадзе.

І пусціў ганцоў дамоў,
Усім вядома, без штаноў.
А наш пеўнік вось дае! –
Бяжыць ззаду і клюе.

Стаў збірацца хлопец ў шлях,
Хоць і лапці на нагах,
Хоць кашуля ўся на латках,
У тлушчы твар пасля аладкаў.

Але ведае Пятрусь,
Ратаваць як Беларусь.
Усю сваю ўзяў ён зброю
І каня свайго напоіў.

Яго конік Дабрадзей
Не такі, як у людзей.
Добра ён дае капытам,
Што вось-вось узляціць нібыта.

Памаліўся хлопец Богу
І пайшлі яны ў дарогу:
Гусь, Пятрусь і Дабрадзей,
Каб сабраць звяроў, людзей.

Пятрусь: *«Пойдзем з вамі мы збіраць*
Усіх, хто можа ваяваць».
Толькі выйшлі з-за варот,
Стаіць корч, падпёршы плот.

Пятрусь: *«Што за нечысць, што за корч?*
Нейкі надпіс: «Sprechen Deutsch»?
Буду вам яшчэ я шпрэхаць,
Можа, мне закукарэкаць?!»

Корч ушчэнт ён раскалоў,
Не пакінуў чужых слоў.
І зрабіў Пятрусь знарок
Ладны новенькі слупок.

На ім піша надпіс Дуська:
«Гаварыць па-беларуску!!!»
Яны едуць па прасторы,
А вакол адное гора.

Каго ўзялі ў заапаркі,
Ад каго адны агаркі.
Хто варушыцца ледзь-ледзь,
Хто не можа зразумець,

Што рабіць, як жыць далей,
Адабралі ў іх дзяцей.
Хто пабіты, хто кульгавы,
Да вайны няма ім справы.

Хто не адчыняе дзверы,
Бо ні ў што ўжо не верыць.
Падышоў да ўсіх Пятрок,
Увесь ад хвалявання ўзмок.

Падбіраў ён доўга словы,
Урэшце ўсё ж пачаў прамову.
Пятрусь: *«Як на балоце чарот,*
Так і ты, мой любы, мой сціплы народ!

Сотні год цябе забівалі,
Гарады твае, вёскі знішчалі.
Помняць і дубы, і сосны
На душы тваёй барозны.

Вораг, што да нас прыйшоў,
Табе трэба наша кроў?
Табе трэба нашы душы?
Ты спакой наш хочаш узрушыць!

Я скажу табе ў адказ:
«Не жыццё табе у нас!
Сёстры родныя, браточкі,
Зямлі нашай сыны, дочкі!

Я не ведаю, чамусьці
Вы схаваліся ў капусце?
Калі кожны сам сабе,
Ганс усё ў нас адбярэ!

Скажу так, што час прыйшоў
Ворага пагнаць дамоў!
Трэба ўзняць наш родны сцяг,
Пакуль сілы ёсць у нагах!»

Кажуць людзі, кажуць зверы:
«Мы табе, асілак, верым!
І маленькі, і дарослы –
Кожны з нас на Ганса злосны.

Трэба нам залізваць раны
І збірацца ў партызаны!»
Пятрусь кажа: «Гэта справа!
Нас усіх чакае слава!»

Гусь прыйшла да партызанаў,
Правяла пяром па ранах.
Неўзабаве ўсе раненні
Зажываюць у імгненне.

V

Дзед Нічыпар, дзед Панас
Удваіх прыйшлі да нас!
Кажуць: «Колькі нам ужо жыць?
Будзем ворага мы біць!»

Усіх старэйшы дзед Макар:
«І ў мяне яшчэ ёсць пар!»
Падыходзяць і жанчыны,
Кажуць: «Будзем ставіць міны».

І выходзіць заяц з морквай:
«Я валодаю вінтоўкай!»
Трус таксама не дрыжыць
І за зайцам услед бяжыць.

Нават і парсюк пузаты,
І той валодае гранатай.
Каршунам мядзведзь крычыць:
«Мяне будзеце будзіць?»

Бусел моцна так клякоча,
Каршуноў таўчы ён хоча.
А бабёр наш точыць зубы,
Ён гатовы грызці трубы.

А дзічок вастрыць клычок,
Каб аўчарцы даць у бок.
Робяць весела тхары
Маскіроўку ўсю з кары.

А краты дык, а краты
Падрываюць пад масты.
Нават рыжая вавёрка
У дазоры глядзіць зорка.

Падышлі і бык з каровай.
Бык: «Я стары, але ж здаровы,
Хлопец вельмі я упарты,
Дакажу, чаго я варты.

Не баюся я дарогі,
Ворага ўздыму на рогі!»
І гавораць нават мошкі:
«Мы вам дапаможам трошкі!»

Пятрусь: *«Гэта хто там? Хто там гэта*
Паўзе важны з пісталетам?
Нешта фыркае пад нос:
«Не стрымае вораг слёз».

Пятрусь: *«Гэта ж вожык, наш Сярожык*
Навастрыў іголкі, ножык.
Ты ж маленькі, не расцеш,
Як ты ворага паб'еш?»

Вожык: *«А я выверну калючкі,*
Будзе ім пракол балючы!»
Кажа свінка Еўфрасіння:
«Хто не любіць нас, хай згіне!»

VI

Воўк з лісою – паліцаі
Усё пра Дусю расказалі.
Ганс, вядомы ўсім вар'ят,
Служкам даў сваім загад:

«Хоць што хочаце рабіце,
А пяро мне прынясіце!»
Вырашылі ўначы
Дусю і падсцерагчы.

І нямецкія салдаты
Ставяць на яе гарматы.
Толькі Дуся ўзляцела,
Атрымала ў бок два стрэлы.

І крычыць ў ляску зязюля:
«Збіла гусю ку-ку-куля!!!»
Дусю доўга катавалі
І ўсе пёры разам знялі.

Пацямнелі ўсе пёры,
А адно гарыць, як зоры.
Танс яго ў рукі ўзяў,
У захапленні закрычаў:
«Усім валодаць буду светам,
Вось цяпер з пяром я гэтым!!!»

VII

Сабраліся партызаны,
Розныя гавораць планы,
Як патрэбна паступаць
Дусю каб выратаваць.

Вырашылі раніцой
Ворагу даць жорсткі бой.
А ў Ганса самалётаў,
Танкаў, розных куляметаў!

А наш асілак на кані –
Толькі ты яго спыні.
Едзе ён на Дабрадзеі,
Пра ўсе ведае падзеі.

Далажыла ўсё разведка,
Памыляецца крот рэдка.
Усе пазіцыі і планы
Ведаюць і партызаны.

Распачаў асілак бой,
Б'е сякераю сваёй.
Стаіць трэск, ляцяць апілкі,
Немцаў носяць на насілках.

Б’юцца волаты-зубры
Ад зары і да зары.
Сталь кіпіць, узнялася глеба,
Усё чорным стала неба…

І спынілася нарэшце
Усё нямецкае нашэсце.
Цішыня. Замоўклі бойкі,
Паляглі абодва войскі.

На калені ўстаў Пятрусь:
«Загубіў я Беларусь!!!»
У вушах страшэнны гул,
І аднекуль ён пачуў:

«Твая Дуся недалёка,
Да яе ўсяго два крокі, –
Пралятаўшы, матылёк
Волату зрабіў намёк. –

Яна ў Гансавай цямніцы
Памірае без вадзіцы».
І мурашкі падказалі:
«Яе там замуравалі».

І, абняўшы Дабрадзея,
Пятрусь кажа: «Ёсць надзея!»
Вады выпіўшы з крыніцы,
Пайшлі разам да цямніцы.

VIII

Ля цямніцы жыў пітон,
Прабіваў хвастом бетон,
З каскаю на галаве.
Ганс Пітошаю заве.

Пятрусь: *«Пальцам пханая каўбаска!*
Дай прайсці нам, калі ласка».
Пітон: *«Я табе за каўбасу*
Зараз галаву знясу».

Пятрусь: *«Знясі лепш сабе яечка,*
Пханай каўбасы калечка!»
Злосны стаў зусім пітон,
Надаваў ён ім хвастом.

І абодвух закруціў,
У цямніцу не пусціў.
Пітон: *«Што адкажаш, Петрусёк,*
Зможаш ты без рук, без ног?»

Пятрусь: *«Я здавацца не прывык,*
Ёсць у мяне яшчэ язык».
І пачаў Пятрок свісцець,
Гвалтаваць і песні пець.

І не вытрываў Пітоша:
«Усё прасі, што толькі хочаш!
А ў цямніцу не пушчу».
Пятрусь: *«Я і сам ужо не хачу!*

Б'е мой конік капытом,
Лепш, чым ты сваім хвастом».
Пітон: *«Хто? Твой конь? Давай праверым,*
Хто хутчэй разбурыць дзверы!»

Сталі разам у сцену біць,
Пыл з каменнямі ляціць.
Б'е пітон і не баіцца
Таго, што можа заваліцца.

Так у сцену малаціў,
Нават каску ён згубіў.
І прысыпала пітона
Ад сцяны тае бетонам.

Адчыняе Пятрусь клетку:
«Што з табой зрабілі, дзетка?
Уся без пёраў, у крыві,
Мая мілачка, жыві!»

Дуся: *«Я цябе, Пятрусь, чакала,*
Без цябе не паміралa.
А цяпер той час прыйшоў,
Ужо стыне мая кроў.

І пакуль яшчэ жывая,
Ведай, я цябе кахаю!
Ціха, міленькі, маўчы,
Я знікала ўначы,

Бо ты, ведаеш, Пятрусь,
Што я дзеў...» Памерла гусь.
На руках яе трымае:
«Дык і я ж цябе кахаю!»

І з'явіўся Ганс знянацку,
У руках трымае цацку.
Пяро свеціцца, як зорка.
Ганс: *«Што табе, асілак, горка?*

Што табе ўжо губляць?
Будзеш мне ты слугаваць!»
Пятрусь: *«Я скажу табе, вар'ят,*
Мне пляваць на твой загад!

І на ўсе твае жаданні!
Цябе чакае пакаранне».
Ганс: *«Слухай, я пяром узмахну*
І адыдзеш ты да сну,

Але, ведай, чалавеча,
Гэты сон твой будзе вечны!»
Толькі Ганс пяро ўзняў,
На зямельку сам упаў.

Немым голасам крычыць:
«Не, Пятрусь, хачу я жыць!»
Пятрусь: *«Мне цябе ніяк не шкода.*
Ад імя свайго народа

Буду я цябе судзіць,
Не павінен больш ты жыць!»
І ад усякае халеры
Галаву адсек сякерай.

IX

Выйшаў ён на поле бітвы,
Богу прачытаў малітву.
Успомніў матчыну прамову,
Пра зярнятка яе словы,

Адшукаў яго ў кішэні.
Стаў Пятрусь зноў на калені
І зярнятка ў кроў кідае,
Што адбудзецца, чакае.

І прабіўся з-пад зямліцы
Струмень чыстае вадзіцы
І празрыстай, і жывой,
Лье на месца, дзе быў бой.

Лье на гарады, на вёскі
І змывае ўсе іх слёзкі.
Ад вады, ад змытых слёз
Красачкамі луг зарос.

Хто памёр на самой справе,
Ажывае неўзабаве.
Усе мужчыны і жанчыны,
Хлопцы іхнія, дзяўчыны,

Зайчаняты і ягняты,
Вожыкі, мядзведзяняты,
Коні, свінні і каровы –
Усе жывыя і здаровы.

Усе да волата бягуць,
Славу вечную пяюць.
Дзеўчына красы нябеснай
Петрусю хлеб-соль прынесла.

Усё ж нядобра Петрусю:
«А ці бачыў хто Гусю?
Дзеўчына: *«І ніхто ўжо не ўбачыць!»*
Пятрусь: *«Адкажы, што гэта значыць?*

Бо, мне нешта так здаецца,
Яе сэрца блізка б'ецца».
Дзеўчына: *«Цішэй, міленькі, маўчы,*
Я знікала ўначы.

Бо, ты ведаеш, Пятрусь,
Што я дзеўчына – не гусь!»
Яе на рукі ўздымае:
«Мая Дусечка жывая!!!»

І парсюк выходзіць Борка:
«Будзе ў нас вяселле. Горка!»
«Горка!» – усе крычаць вакол
І нясуць вялікі стол,

Ставяць розныя прысмакі.
Пятрусь дзеўцы робіць знакі:
«Што ж, няма куды дзявацца.
Горка! Будзем цалавацца!»

І сядзелі на Случы,
Пелі песенькі ўначы.
Надакучыла спяваць –
Пайшлі разам танцаваць.

Так «лявоніху» давалі –
На стале збаны скакалі.
Самы стары дзед Макар:
«І ў мяне яшчэ ёсць пар!»

Выйшла з ім старая Зося,
Танцавалі, як прыйшлося.
Макар: *«Калі хочаце здзівіцца,*
Дык давайце маладзіцу!»

Выйшла ладная Ірэна,
Танцавалі «макарэну».
Усе пападалі вакол,
Нахіліўся нават стол.

З гэтым дзедам няма ладу,
Танчыць стаў яшчэ «ламбаду».
Дзед на дзеўчыну дзівіцца:
«На табе хачу жаніцца!»

Ірэна: *«Ты таксама, дзед, мне любы,*
Я схіляюся да шлюбу».
Было слаўнае вяселле,
Нават пчолы ноч гудзелі.

Потым, не прайшло і году,
Дачакаліся прыплоду:
Дзве дзяўчынкі, пяць хлапцоў.
Сем прыгожых малайцоў…

У каго ж дзяўчынак пара?
Усім вядома – у Макара!
У Петруся аж пяць хлапцоў –
Больш ад шчасця няма слоў…

Эпілог

Пятрусь: *«Мая зямля! Іду я босы*
Па жніве тваім бялёсым,
Па лугах тваіх духмяных
Я іду зачараваны.
Я іду па тваім лесе –
Лес шуміць, спявае песню.
Па барах тваіх іду я,
Ціха сам сабе сумую.
Сотні год цябе знішчалі,
А твае зерні прарасталі…»

ЗМЕСТ

Вершыкі 3

Бегемоцік 4
Бычок і козачка 6
Бабёр 9
Конь сябруе са сланом 10
Разышоўся хлопчык Федзя 13
Дзед Мароз 16
Цяльпук 18
Камарык 20
Сонейка 22
Салавейка 24
Наша курка 27
Грыбочкі 28
Толік і памідорык 31
Хлусы 34
Юля і варона 37
Слон і парасон 40
Наша дзеўчына Паліна 42
Алежак і арэшак 44
Варона 46

Як судзілі Жырафу 52
Пяе ветрык 55

Казачкі 57

Неразумны парсючок 58
Казачка пра песцік і тычынку 72
Паслухмяныя і не 95

Баечкі 113

Знакаміты мядзведзь 114
Кот і мышы 119
Як Гусь і Пятрусь ратавалі Беларусь 124

Літаратурна-мастацкае выданне

Старынчык Алег Анатольевіч

КАЗАЧКІ, БАЕЧКІ, ВЕРШЫКІ ДЛЯ МАЛЕНЬКІХ І ДАРОСЛЫХ

Мастак Жыткевіч Алеся

Падпісана да друку 19.10.2011 г.
Фармат 60х84 1/16. Бумага афсэтная.
Уч. выд. арк. 8,84. Наклад 500 экз.
Заказ № .

Выдавец: ТАА «Мэджык»
ЛП №02330/0552505 ад 09.06.2009 г.
220113 г. Мінск, вул. Я. Коласа, 21.